**МАТЫЎ** (ад італьян. motivo падстава, заахвочванне), 1) у музыцы — найпрасцейшая рытмічная адзінка мелодыі, якая складае характэрную частку муз. тэмы; папеўка, напеў, мелодыя. Пад М. разумеюць кароткую муз. ідэю, якая з'яўляецца вынікам муз. фігуры; муз. фрагмент ці паслядоўнасць; адзіную меладычную, рытмічную або гарманічную ячэйку; адну ці больш ячэек, што застаюцца элементамі ці фразай у межах пэўнага кантэксту; самую кароткую разбіўку для тэмы ці фразы, якая змяшчае ў сабе цэласную муз. ідэю. У большасці выпадкаў М. заключае адну моцную метрычную (тактавую) долю. Для засваення сэнсу песеннасці і формы напеваў праз іх інтанаванне важна адрозніваць М. (характэрныя папеўкі) на слых, паколькі інтанацыя не тоесная М., а ўключае толькі невял. гукавыя папеўкі (абароты) у аб'ёме М. і інтэрвалаў. Папеўка як устойлівая адзінка М. з'яўляецца адным са сродкаў мелодыка-інтанацыйных характарыстык напеваў. У песенным фальклоры ўсх. славян сустракаюцца вершаваныя, страфічныя і тыповыя напевы-формулы. Апошнія выкарыстоўваюцца пры маст. абагульненні першасных «інтанацый-эмоцый» (заклік, плач, галашэнне), а таксама для сістэматызацыі песеннага фальклору беларусаў.

2) У літаратуры — устойлівы ідэйна-тэматычны ці вобразна-эмацыянальны кампанент, прадвызначаны колам жыццёвых з'яў, на якія асабліва чуйна рэагуе пісьменнік. Часам адны і тыя ж М. праходзяць праз шэраг літ. твораў і нават усю творчасць пісьменніка, утвараючы *лейтматыў*. Да М. адносяць і т.зв. вечныя тэмы: прыгажосць, дабро, сумленне, страх, каханне, смерць. У паэзіі крытэрыем М. ў большасці выпадкаў выступае наяўнасць ключавога, апорнага слова, якое нясе асаблівую сэнсавую нагрузку. Для апавядальных і драм. твораў, найбольш насычаных дзеяннем, характэрны сюжэтныя М.

*А.М.Аляхновіч* (музыка).

**МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА**, сукупнасць матэрыяльных каштоўнасцей, створаных чалавецтвам у працэсе гіст. грамадска-карыснай дзейнасці, — прылады працы, жыллё, адзенне, ежа, транспартныя сродкі, культавыя і быт. рэчы, прадметы мастацтва і інш. Адлюстроўвае ўзровень вытворчых сіл і экалагічнасць асваення прыроды чалавекам. Арганічна звязана з *духоўнай культурай* у адзінай функцыянальнай сістэме. Узнікла разам з вырабам чалавекам прылад працы, што азначала пераход ад жывёльнага стану да мэтанакіраванай прац. дзейнасці. Гістарычна М.к. развівалася паступальна, захоўваючы пераймальныя сувязі, ад прасцейшых форм, нярэдка запазычаных у прыроды, да складаных канструкцый, разнастайных спецыялізаваных прылад і прафес. твораў мастацтва.

М.к. старaж. часоў узнаўляецца на падставе археал. помнікаў, часткова пісьмовых крыніц, выяў і параўнальнага гіст.-этнаграф. вывучэння. Узнікненне земляробства і жывёлагадоўлі азначала важную вяху ў гісторыі чалавецтва — пераход да вытворчай гаспадаркі. У класавым грамадстве развіццё М.к. беларусаў ішло па шляху дыферэнцыяцыі яе структурных кампанентаў на асобныя тыпалагічныя варыянты, якія адпавядалі пэўнаму роду жыццядзейнасці з улікам мясц. экалагічных і сац.-эканам. умоў. Характарыстыка М.к. ўскладнялася саслоўнай градацыяй, сац. інтарэсамі, запатрабаваннямі, эстэтычнымі густамі. Асн. стваральнікамі М.к. былі бел. сяляне і рамесны люд. Ва ўмовах патрыярхальнага ладу жыцця кожны сялянскі двор выступаў як самаст. вытворчы калектыў з шырокім дыяпазонам гасп. дзейнасці. С.-г. прадукты, тканіны, адзенне, абутак, хатняе начынне, прылады працы, транспартныя сродкі ў пераважнай большасці выраблялiся на месцы ўласнымі рукамі. Універсальны характар сялянскай гаспадаркі з'яўляўся перадумовай шырокага развіцця нар. ўмельства, мясц. самадз. традыцый у М.к. Рост гарадоў і гандлю садзейнічаў развіццю цэхавых рамёстваў, іх спецыялізацыі і павышэнню грамадскай ролі ў сістэме культуры (гл. *Рамёствы і промыслы*). Аўтаномнасць і адносная ізаляцыя ад культуры пануючага класа садзейнічалі развіццю самабытных элементаў і захаванасці ў культуры беларусаў агульнаслав. рыс, што прасочваецца ў этнаграф. матэрыяле да нашага часу. Прамысловы пераварот і развіццё машыннай індустрыі ўнеслі істотныя змены ў развіццё М.к., якая ў многім атрымала стандартызаваныя формы і арыентуецца на масавую вытворчасць і шырокі і ўстойлівы попыт. Аднак прадметы нар. майстроў і ўмельцаў, якія адлюстроўваюць глыбокія традыцыі і духоўную сувязь пакаленняў, па-ранейшаму застаюцца аптымальнымі ўзорамі (матрыцамі) для развіцця нац. форм прафес. мастацтва. Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі даюць новы імпульс і ўносяць значныя карэктывы ў механізм міжэтнічнага ўзаемадзеяння, у змест этнакульт. (інтэгральных) працэсаў, не змяняючы нац. характар культуры і яе ролю ў арганізацыі нац. цывілізацыі як асновы суверэннай дзяржавы.

*Літ.*: Цітоў В.С. Народная спадчына: матэр. культура ў лакальна-тыпал. разнастайнасці. Мінск, 1994; Яго ж. Этнаграфічная спадчына: Беларусь: Традыцыйна-бытавая культура. 2-е выд. Мінск, 2001.

*В.С.Цітоў.*

**МАЎЗОН** Аркадзь (сапр. Маўшэнзон Арон Іосіфавіч; 23.9.1918, г. Віцебск — 19.8.1977), беларускі драматург. Вучыўся ў драм. студыі пры Бел. першым дзярж. тэатры (1936). Працаваў у Бел. тэатры імя Я.Коласа. З 1946 заг. аддзела газ. «Віцебскі рабочы», з 1950 на к/студыі «Беларусьфільм». У 1965—71 у Мінве культуры Беларусі. У творах М. адлюстроўваў гераічныя падзеі гісторыі краіны, раскрываў духоўны свет чалавека. Аўтар п'ес «Канстанцін Заслонаў» (паст. 1947; аднайм. к/фільм

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ